*У.І.РЫНКЕВІЧ*

## СТАНАЎЛЕННЕ БЕЛАРУСКАЙ ПРАФЕСІЙНАЙ ГРАФІКІ

Сацыяльна-эканамічныя абставіны, якія склаліся ў Беларусі ў пачатку XIX ст., актывізавалі працэс пераходу ад цэхавага, паўсамадзейнага графічнага мастацтва да прафесійнага, аснову якога складае спецыяльная падрыхтоўка мастакоў у вышэйшых навучальных установах.

У папярэдняе стагоддзе мастацкая адукацыя на беларуска-літоўскіх землях амаль адсутнічала. Пачатковыя навыкі па малюнку можна было атрымаць у езуіцкіх калегіумах, якія існавалі ў многіх гарадах Беларусі і адыгрывалі станоўчую ролю ў развіцці культуры. Адным з найбольш значных адукацыйна-мастацкіх асяродкаў на тэрыторыі Беларусі быў Полацкі езуіцкі калегіум (з 1812 г. – Полацкая езуіцкая акадэмія). Тут захоўваліся беларускія культурна-гістарычныя традыцыі з часоў утварэння калегіума П.Скаргам (1580). Побач з лацінскай мовай на практычных занятках і на тэатральнай сцэне гучала беларуская [2, с. 57]. Кабінеты і лабараторыі гэтай навучальнай установы былі доб-ра аснашчаны, інтэр'еры аформлены карцінамі італьянскага жывапісца Разаці і беларускага мастака С.Чаховіча (1689–1775). Яго ж рукі роспіс «Звеставанне Прасвятой Дзевы Марыі» ў алтары касцёла пры калегіуме.

У калегіуме працаваў энтузіяст сваёй справы – архітэктар і неблагі мастак, генерал ордэна езуітаў Габрыель Грубер (1738–1805). Каштоўным гістарычным дакументам і унікальным творам мастацтва з'яўляецца вялікая гравюра "Від Езуіцкага калегіума ў Полацку" (медзярыт, 47,7× 67, 1785), выкананая па малюнку Грубера. У велічы формаў дакладна пабудаванай у перспектыве архітэктуры з калонамі, скульптурамі і аркамі, праз якія бачныя караблі на Заходняй Дзвіне, мастак увасабляе ідэю трыумфу навукі. Па яго праекту быў пабудаваны асобны корпус, дзе размясціліся абсерваторыя, вучэбныя лабараторыі, музей тэхнічных вынаходніцтваў і карцінная галерэя, якую Грубер разам з вучнямі аздобіў фрэскамі. Тут працавалі першакласныя педагогі: французскія мастакі Якуб Перліні і Якуб Журдэн, якія выкладалі рысунак [1, с.14]. У калегіуме вучыліся многія ў будучым знакамітыя нашы землякі: В.Ваньковіч, К.Бароўскі, Р.Слізень і іншыя, якія пасля заканчэння калегіума прадоўжылі мастацкую адукацыю ў Віленскім універсітэце.

Віленскаму імператарскаму універсітэту належыць заслуга пачынальніка аб'яднання мастацкай адукацыі з традыцыйным універсітэцкім навучаннем, што было беспрэцэдэнтнай з'явай у еўрапейскай сістэме адукацыі. На працягу больш за 30 гадоў існавання Віленская мастацкая школа рыхтавала мясцовых мастакоў і настаўнікаў малявання для школ і гімназій Віленскай навучальнай акругі, творчасць якіх вызначыла развіццё беларускай графікі першай паловы XIX ст.

Узровень і характар навучання мастацтву шмат ў чым залежалі ад асобы кіраўніка. У гэтай сувязі дзейнасць мастацкага аддзялення школы можна ўмоўна падзяліць на тры перыяды. Першы (1797–1807) – этап станаўлення мастацкага аддзялення, працягваўся ад заснавання Ф.Смуглевічам кафедры рысунка і жывапісу да змены кіраўніцтва. Другі (1810–1818) вызначаўся прыярытэтным развіццём на мастацкім аддзяленні гравёрнай майстэрні Ю.Саўндэрса. Трэці (1819–1832) – перыяд функцыянавання школы на чале з Я.Рустэмам, які завяршыўся разам з закрыццём універсітэта. (Падрабязна аб гэтым гл.: Рынкевіч У. Віленская мастацкая школа // Адукацыя і выхаванне. – 2002. – № 6.)

Прафесар Францішак Смуглевіч (1745–1807), заснавальнік кафедры жывапісу, быў вядомы на Беларусі як аўтар шматлікіх палотнаў гістарычнага жанру і многіх роспісаў на біблейскія сюжэты. Стылёвая арыентацыя Ф.Смуглевіча на класіцызм садзейнічала таму, што роля акадэмічнай штудыі і хуткага рысунка ў Віленскай школе бала ўзнята на высокі ўзровень. Яго вучні Каспар Бароўскі, Юзэф Пешка, Юзэф Аляшкевіч, Ян Дамель выдатна праяўлялі атрыманыя навыкі і асабістыя здольнасці ў стварэнні складаных шматфігурных кампазіцый.

Віртуозным майстрам пёравага накіду быў Ян Дамель – адзін з найбольш яскравых прадстаўнікоў першай генерацыі выхаванцаў Віленскай мастацкай школы. Большую частку жыцця ён пражыў у Мінску, яго прах і зараз пакоіцца на Кальварыйскіх могілках. У тым, што " Ян Дамель і Валенці Ваньковіч – найбольш вялікія жывапісцы віленскай школы, аўтары найвыдатнейшых карцін" атабарыліся ў найзападнейшых аколіцах – пясках і багнах Палесся…( у Мінску. – *У.Р.*), была не толькі выпадковасць, але і заканамернасць", – пісаў першы біёграф Дамеля, ураджэнец Случчыны Адам Шэмеш [4, с. 164]. Графічная спадчына Я.Дамеля складае

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

сотні аркушаў паасобку і ў альбомах. Пяро ў яго руцэ набывала, здаецца, поўную свабоду дзеяння і энергію ўвасаблення эмацыянальна-пачуццёвага зместу. Шматлікія замалёўкі антычнага і гісторыка-этнаграфічнага зместу сведчаць аб захапіўшай аўтара плыні неакласіцызму. Аб прызнанні прафесійнага майстэрства мастака ўказвае той факт, што па яго рысунках ствараў медзярыты прафесар Ю.Саўндэрс.

У 1805 г. у Віленскім універсітэце быў уведзены курс графікі, кіраўніком якога прызначылі вопытнага віленскага гравёра Ізідора Вейса. Ён выдатна валодаў прафесійным майстэрствам, але не паспеў стварыць сваёй школы гравёрства. Вейс зрабіў першыя, можа, самыя цяжкія, крокі на шляху станаўлення спецыялізацыі гравёрнага мастацтва ў Віленскім універсітэце.

Новы перыяд дзейнасці Віленскай мастацкай школы распачынаецца з уступленнем на пасаду прафесара ў 1810 г. Юзэфа Саўндэрса (1773–1845). На той час ён быў ужо знакамітым у Заходняй Еўропе і Расіі гравёрам-партрэтыстам і ілюстратарам. Акрамя асноўнай спецыялізацыі, у Віленскім універсітэце Саўндэрс выкладаў англійскую літаратуру і ўпершыню сярод еўрапейскіх універсітэтаў чытаў курс гісторыі мастацтва, а таксама займаўся публіцыстыкай. Праз некалькі гадоў яго вучні Г.Кіслінга, В.Славецкі, М.Падалінскі набылі такі вялікі аўтарытэт, што ім даручалі адказныя заказы, для выканання якіх раней запрашалі гравёраў з Пецярбурга.

Адным з найбольш таленавітых вучняў Саўндэрса быў Міхал Дамінікавіч Падалінскі (1783–1853). Гэта найбольш яркая творчая асоба беларускай графікі першай паловы XIX ст. Выдатны майстар медзярыту і афорта, рысавальшчык, педагог нарадзіўся і памёр у Беларусі, вучыўся і працаваў у Расіі і Літве. У гісторыі беларускага мастацтва ён – фігура знакавая. Яго творчасць распачала новы этап у развіцці беларускага эстампа на аснове прафесійнай мастацкай адукацыі. Падалінскі прыехаў вучыцца гравёрнаму мастацтву ў Вільна з Пецярбурга. Гэта адзіны вядомы нам выпадак, калі ў Віленскай мастацкай школе вучыліся пасля Пецярбургскай мастацкай акадэміі, а не наадварот. Да таго ж ён ужо меў значны вопыт гравіравання, працуючы у 1806–1808 гг. над ілюстрацыямі да альбома "Эрмітаж" К.Лабеньскага разам са сваім будучым настаўнікам Саўндэрсам.

Графічная спадчына М.Падалінскага складаецца з ілюстрацыйных гравюр, эстампаў партрэтнага і пейзажнага жанраў. Найбольш значныя станковыя творы майстра – партрэтная галерэя прафесараў Віленскага універсітэта. Адзначаная рысамі высокага класіцызму, сёння яна з'яўляецца каштоўным мастацкім і іканаграфічным матэрыялам. Арыгіналамі для гравюр служылі як асабістыя малюнкі, так і жывапісныя палотны мясцовых мастакоў, у асноўным Рустэма ("Партрэт Герберскага", "Партрэт Гродгера" і інш.). У шырокіх ландшафтных краявідах, блізкіх да рамантычнага ўвасаблення і з цікавасцю да бытавых ідылічных сцэн на фоне прыроды, прасочваюцца рысы бідэрмаерскага тыпу пейзажа. Апошнія дзесяцігоддзі жыцця Падалінскі настаўнічаў у Бабруйску, Магілёве, Мінску, Маладзечне. У развіцці беларускай станковай графікі творчасць М.Падалінскага стала значнай вяхой, а яго імя падоўжыла спіс знакамітых імёнаў беларускіх гравёраў, сярод якіх Пётр Мсціславец, Томаш Макоўскі, Аляксандр Тарасевіч, Максім і Лявон Вашчанкі.

Натуральна, што менавіта Віленскі універсітэт, цэнтр навучальнай акругі, стаў заснавальнікам першай літаграфічнай майстэрні ў нашым краі. Актыўная дзейнасць універсітэцкай літаграфіі распачынаецца з 1821 г., калі яе друкарамі былі выхаванцы школы, ураджэнцы беларускіх губерняў Вінцэнт Славецкі і Хелары Главацкі, а з 1829 г. М.Пшыбыльскі. Акрамя кніжных ілюстрацый і метадычнай нагляднасці, тут ствараліся партрэтныя эстампы і віды Вільна.

Лепшыя выхаванцы Віленскай школы прыходзілі на змену сваім замежным настаўнікам. Другім пасля Падалінскага выкладчыкам гравёрства стаў Готліб Кіслінг. Менавіта ён здзейсніў апошні акт існавання Віленскай мастацкай школы – склаў спіс гравюр, карцін і інвентару для перадачы ў фонды Кіеўскага і Харкаўскага універсітэтаў. Апошнія гады жыцця Кіслінг працаваў ў Віцебскай жаночай гімназіі.

Характарызуючы дзейнасць Віленскай мастацкай школы, трэба мець на ўвазе два аспекты. Па-першае, вялікае значэнне, якое яна адыграла ў першай палове XIX ст. у агульнакультурным маштабе ў развіцці і папулярызацыі графічнага мастацтва сярод насельніцтва. Па-другое, яе вызначальную ролю ў пачынанні якасна новага этапу развіцця беларускай графікі на аснове прафесійнай мастацкай адукацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Пасля закрыцця універсітэта (1832) дзейнасць мастакоў Віленскай школы працягвалася да сярэдзіны XIX ст. З тых мастакоў, якія засталіся на радзіме, многія ўладкаваліся настаўнікамі малявання ў школах і гімназіях края. М.Пшыбыльскі, А.Клукоўскі, Ю.Азямблоўскі заснавалі прыватныя літаграфічныя прадпрыемствы ў Вільні. Працягвалі сваю творчую дзейнасць Валенці Ваньковіч, Іван Хруцкі, Канута Русецкі, Адам Шэмеш, Томаш Гесе, Карал Рыпінскі, Каспар Бароўскі, Томаш Лукашэвіч, Канстант Кукевіч і інш. Літаграфічныя альбомы пейзажаў роднага краю выдалі М.Кулеша, К.Кукевіч. Адной з найбольш яркіх творчых асоб у гэты перыяд быў беларускі мастак-літограф Казімір Бахматовіч. Яго альбомныя серыі ("Успамін аб Дабраўлянах", "Успамін аб Вільна", "Арласіяда" і інш.) і асобныя графічныя аркушы засталіся для нашчадкаў выдатным іканаграфічным матэрыялам, у якім з рэалістычнай праўдзівасцю мастак адлюстраваў уклад гарадскога жыцця таго часу, норавы прадстаўнікоў розных слаёў грамадскасці.

Беларуская графіка першай паловы XIX ст. у сваім развіцці прайшла праз усе мастацкія стылі, характэрныя для еўрапейскага мастацтва таго часу. Станковая графіка сфарміравалася як самастойны від творчасці з шэрагам разнавіднасцей па матэрыялах і тэхніках стварэння арыгінальнай і тыражнай графікі. Імклівае распаўсюджанне гэтага віду мастацтва ў сацыяльнай сферы, сталы выканаўчы ўзровень, асабліва ў тэхніках пёравага малюнка, металагравюры і літаграфіі, сведчылі аб высокай прафесійнай пазіцыі, дасягнутай у развіцці графічнага мастацтва. Наступны этап ўздыму беларускай графікі, параўнальны гэтаму, адбыўся больш чым праз сто гадоў, ужо ў савецкі час.

---

1. *Буйвал В.* Маэстра Валенці // Наша вера. – 2000. – № 1 (11).

2. *Конон В.М.* От Ренессанса к классицизму. Становление эстетической мысли Белоруссии в XVI–XVIII вв. / Ред. А.С.Майхрович. – Мн.: Наука и техника, 1978. – 160 с.

3. *Рынкевіч У.* Віленская мастацкая школа // Адукацыя і выхаванне. – 2002. – № 6.

4. *Szemesz A.* Wspomnienia o Damelu // Athenaeum. – 1842. – T. 2.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ